РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 САКАВІКА 2025 г. ЧАЦВЕР № 45 (30433)

«ГЭТА БУДЗЕ Ў ІНТАРЭСАХ УСЁЙ ПЛАНЕТЫ»: МІРНЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ САПРАЎДНАГА ЛІДАРА

Доўгачаканыя падрабязнасці інтэрв'ю Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі амерыканскаму блогеру. Як заўсёды — адкрыта і шчыра. Пра Трампа, Пуціна і Зяленскага, пра магчымасць міру ва Украіне, пра «чырвоную кнопку» і мяцеж «вагнераўцаў»... Чытайце — будзе вельмі цікава!

(Працяг на 2–3-й стар.)

СЕЗОННЫ КЛОПАТ

Вясна прыспешвае аграрыяў

Як вядома, кіраўнік дзяржавы запатрабаваў да 1 сакавіка паставіць на лінейку гатоўнасці ўсю глебаапрацоўчую тэхніку, якая будзе занятая вясной. І даручыў сваім памочнікам і прадстаўнікам ва ўсіх рэгіёнах самым строгім чынам пракантраляваць сітуацыю на месцах, што і было зроблена. Якая сітуацыя цяпер?

Апошнім часам надвор'е досыць хутка прырастае станоўчымі тэмпературамі. З кожным днём набліжаецца «гадзіна пік» — старт актыўных работ на палях. Цалкам верагодна, што масавая сяўба збожжавых пачнецца адразу пасля выхадных, а можа, і раней, адзначыў **начальнік Галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Мікалай ЛЕШЫК.** Усё залежыць ад таго, як хутка прагрэецца зямля.

СТАР. 5

ДА СЯЎБЫ ГАТОВЫЯ

Фота БелТА.

СКЛАДНІКІ ПОСПЕХУ ВОЛЬГІ БУЛАЙ 9

ГАЛОЎНЫ ПРЫЯРЫТЭТ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ 11

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

ЭНЕРГАЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

КАНЦЭНТРАВАНАЕ ПАЛІВА МЯСЦОВАГА ВЫРАБУ

Для насельніцтва кошт пелет значна зменшыўся

Беларусь валодае вялікімі магутнасцямі па вытворчасці драўняных паліўных гранул, так званых пелет. Іх вытворчасць і выкарыстанне знаходзяцца на жорсткім кантролі кіраўніка дзяржавы. Днямі падчас фарміравання новага складу ўрада, кажучы пра дзейнасць Беллеспаперпрама, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу старшыні канцэрна, што для работы ёсць усё, трэба толькі дзейнічаць. «Мы дамовіліся: пелеты і яшчэ раз пелеты — гэта паліва. Мы разбэсціліся зусім: танны прыродны газ, таму дровы і іншае нам не трэба». Гэты адносна новы від паліва мае сур'ёзныя перавагі, падзяліўся дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Віталь КРЭЦКІ.

Напрыклад, высокая шчыльнасць такога паліва, за кошт чаго пелеты зручна перавозіць і захоўваць. Акрамя таго, высокая цеплатворная здольнасць, якая ледзь ці не раўняе іх з газам, але галоўнае — кошт. Унутры краіны кошт драўняных паліўных гранул у разы ніжэйшы, чым таго ж прыроднага газу.

Сёння для арганізацый камунальнай формы ўласнасці Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі і арганізацый, якія ўваходзяць у сістэму Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва і Міністэрства энергетыкі, установлена зніжаная цана на пелеты. І складае яна цяпер 160 рублёў за тону.

СТАР. 6

«ТРЭБА ДАМОВІЦЦА»: ПРА ТРАМПА, ПУЦІНА І ЗЯЛЕНСКАГА, ЗДЗЕЙСНЕНЫЯ ПРАДКАЗАННІ І МАГЧЫМАСЦЬ МІРУ

Галоўнае — з рэзананснага інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі блогеру Марыа Наўфалу для сацсеткі X

Адбылася прэм'ера рэзананснага інтэрв'ю Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі для амерыканскага блогера Марыа Наўфала. Дарэчы, паўтарагадзіннае інтэрв'ю адбылося яшчэ ў чацвер, 27 лютага, падчас якога беларускі лідар шчыра і адкрыта адказаў на многія пытанні, якія ў тым ліку датычыліся вельмі няпростай цяперашняй сітуацыі ў свеце, перспектыў завяршэння вайны ва Украіне, палітыкі новай адміністрацыі ЗША і асабіста Прэзідэнта Дональда Трампа. Расказаў кіраўнік беларускай дзяржавы і аб пазіцыі Расіі па шэрагу пытанняў, сваіх размовах з Уладзімірам Пуціным і маючым адбыцца візіце ў Маскву.
Прэзідэнт выказаў пазіцыю аб тым, што ў цэлым паміж Усходам і Захадам не павінна быць нейкіх перашкод для супрацоўніцтва. Галоўны тэзіс Аляксандра Лукашэнкі — пра мір, неабходнасць як мага хутчэй спыніць любыя канфлікты і наладзіць паміж значнымі сусветнымі гульцамі нармальнае і давернае супрацоўніцтва.
Ад гэтага, упэўнены ён, выйграюць усе бакі. У нашым матэрыяле — галоўныя цытаты на розныя тэмы з інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі.

Фота БелТА.

> «Я ГАТОВЫ РАБІЦЬ УСЁ ДЛЯ СПЫНЕННЯ ВАЙНЫ»: ПРА ТРАМПА І НОВУЮ АДМІНІСТРАЦЫЮ ЗША

«Ніхто не мог і падумаць. Але адзін чалавек, які рызыкнуў гэта зрабіць, — Дональд Трамп — вельмі хутка сітуацыю з галавы на ногі паставіў. Будзем спадзявацца».

«Яны малайцы. І Трамп малайчына, што ён часта гаворыць і штосьці робіць ужо ў напрамку таго, каб спыніць вайну ва Украіне, спыніць вайну на Блізкім Усходзе. Гэта дарагога варта ў знешняй палітыцы. Мне здаецца, і іншай палітыкі няма ў яго, як спыніць вайну. Выдатная ідэя. Вось тут я гатовы стаць побач і рабіць усё тое, што неабходна для спынення вайны і паляпшэння жыцця людзей».

«Малайчына, што ён пачаў рабіць рэвізію. USAID (Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці. — **Заўв. рэд.**) закрылі і гэтак далей. Чым яны займаліся? Яны фінансавалі перавароты ў краінах. Амаль больш за пяць мільярдаў — тое, што проста вядома пакуль, было накіравана ва Украіну для таго, каб учыніць Майдан. Навошта? І мы гэта ў 2020 годзе перажылі. Наш мяцеж унутры Беларусі фінансаваўся з гэтых крыніц».

«Пасля ўсяго, што было ў ЗША, падтрымліваючы Трампа публічна, я не думаў, што ён пераможа. І калі ён перамог, я адкрыта сказаў, што ён, як бульдозер, прайшоў па Злучаных Штатах Амерыкі і перамог. Неверагодна. Гэта неверагодны чалавек. І адбылося неверагоднае. Тое, што яго ледзь не застрэлілі, ён мае рацыю — напэўна, Гасподзь яго выратаваў. Але калі гэта Гасподзь выратаваў яго, то ён жа для нечага яго выратаваў. І не толькі многія на планеце нашай, але і Гасподзь таксама бачыць тое, што вы цяпер робіце ў ЗША, і ацэньвае. І барані вас Гасподзь, вы не зробіце тое, на што ён разлічвае — Гасподзь».

«Жартам гавару: «Вось там, у Амерыцы, мяне не хапае». Вось я Трампу адразу ў вочы сказаў бы, як нельга рабіць. Вельмі шмат заяў, якія наогул не трэба было агучваць… Трэба астыць пасля выбараў. І трэба ў інтарэсах выбаршчыкаў ЗША, перш за ўсё, і, па-другое, усёй сусветнай супольнасці рабіць крокі. У вас не шмат часу, каб даказаць амерыканскаму грамадству, што вы на нешта здольныя. Калі гэтага вы не зробіце, рэспубліканцы пацерпяць вельмі моцнае паражэнне на наступных выбарах. І гэта будзе па заслугах».

> «ВЫБАР ЁСЦЬ ЗАЎСЁДЫ»: ПРА ВАЙНУ І МІР ВА УКРАІНЕ

«Мне здаецца, Пуцін (мы на гэту тэму з ім не размаўлялі, але я ж яго добра ведаю) не думаў, што гэта выльецца ў такую вайну. У адваротным выпадку ён не пайшоў бы на перагаворы. Калі ён убачыў, што гіне вялікая колькасць людзей, Пуцін імгненна пайшоў на перагаворы, каб канфлікт спыніць, каб дамовіцца».

«Выбар ёсць заўсёды. І ў Пуціна, магчыма, быў такі выбар (пачынаць СВА ці не. — **Заўв. рэд.**). Справа нават не столькі ў пашырэнні НАТА на ўсход, а справа ў тых пагрозах, якія ствараліся ва Украіне… Ён адтуль бачыў пагрозы Расіі, і адтуль гэтыя пагрозы публічна паступалі ў яго адрас. Гэта адна з самых важных прычын таго, што адбылося».

«Калі ў Стамбуле працэс ішоў да заключэння мірных пагадненняў, туды прыехаў тагачасны прэм'ер-міністр Англіі Джонсан. Гэта публічна было. І забараніў Зяленскаму ісці да міру. Ён падштурхнуў яшчэ раз Зяленскага да вайны. Я добра ведаю, як на Захадзе кухня гэта функцыянуе. Ніколі Джонсан самастойна гэта не зрабіў бы без таго, каб яго не падштурхнула тагачасная адміністрацыя ЗША. Таму абсалютна ўпэўнены ў тым, што да чарговага вітка эскалацыі ва Украіне маюць дачыненне Вялікабрытанія і адміністрацыя Байдэна».

«Быў пэўны вынік, на які Пуцін часта спасылаецца. Быў дакумент адпаведны. Дакумент значна больш выгадны (для Украіны. — **Заўв. рэд.**), чым цяпер становішча, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — І тады я публічна ўвесь час падштурхоўваў кіраўніцтва Украіны да таго, што трэба заключаць мір, трэба пагаджацца. — Не, мы будзем ваяваць да апошняга ўкраінца. Да гэтага і Захад падштурхоўваў Украіну. Ну вось ваююць да апошняга ўкраінца».

«Мы потым знойдзем, хто вінаваты. Ніхто адказнасці не пазбегне. Мы падрабязна абмяркуем і разбяромся ў прычынах гэтага. Сёння на парадку дня не гэта пытанне…

Толькі з прыходам да ўлады Дональда Трампа пытанне было пастаўлена рубам — спыніць вайну. І ён адкрыта сказаў, што ён можа зрабіць і што будзе, калі вайна не будзе спынена. Правільна сказаў. Гэта сёння галоўнае, а не пошук вінаватых.

Тут мы з амерыканцамі на адной дошцы. Мы павінны зрабіць дзеля гэтага ўсё».

«Украіна вельмі малая для таго, каб разбурыць той свет, у якім мы ўсе жывём — і ЗША, і Кітай, і Расія, і Украіна. Гэта вельмі малая ўзрыўная сіла. Таму трэба з Украінай закончыць. З Блізкім Усходам прасцей будзе закончыць, калі амерыканцы гэтага захочуць. І мне здаецца, што ў гэтым годзе мы гэтыя праблемы вырашым».

> ПРА НЕЖАДАННЕ БЫЦЬ ПАСРЭДНІКАМ, ПАЗІЦЫЮ НАКОНТ ЗАХОДНІХ МІРАТВОРЦАЎ ВА УКРАІНЕ І ЗДЗЕЙСНЕНЫЯ ПРАДКАЗАННІ ЗЯЛЕНСКАМУ

«Больш за ўсё я ненавіджу пасрэдніцтва. Гэта значыць быць

паміж кімсьці і рабіць выгляд, што ты штосьці там можаш... Калі дзесьці штосьці дапамагчы, арганізаваць, падштурхнуць нейкі працэс, калі гэта ў маіх сілах і ў сілах маёй дзяржавы, Беларусі, — з вялікім задавальненнем. Але толькі для таго, каб было людзям лепш. Але я ні ў якім разе не хацеў бы быць нейкім пасрэднікам, асабліва па нармалізацыі адносін ва Украіне».

«Наконт накіравання туды (ва Украіну. — **Заўв. рэд.**) міратворчых сіл. Расія ніколі з гэтым не пагодзіцца. Прынамсі, такая пазіцыя Расіі на сёння. Тым больш што кіраўніцтва Еўрапейскага саюза, перш за ўсё ў асобе Германіі і Францыі, займае на гэты момант вельмі агрэсіўную пазіцыю».

«Я яму (Зяленскаму. — **Заўв. рэд.**) сказаў, што ў ЗША да ўлады прыйдзе новая адміністрацыя, і палітыка зменіцца. Ніхто цябе не будзе падтрымліваць у вайне. Так і адбылося. Усё было прадказана. Не таму, што я вялікі прадказальнік. Але ўсё, што я сказаў, гэта ёсць у сродках масавай інфармацыі. Запіс ёсць адпаведны. Усё гэта і адбылося».

«Тое, што вам шкада Зяленскага, — мне яго таксама шкада. Я да яго ставіўся як да ўласнага сына. У нас з ім былі вельмі добрыя адносіны. Я быў ва Украіне, мы вялі з Зяленскім перагаворы. Ён недурным мне паказаўся чалавекам. Недзе ён нечага не ведаў (гэта былі першыя яго крокі на гэтай пасадзе), ён у мяне пытаў: а гэта як, а як зробіць гэты чалавек, а як трэба зрабіць? Такія былі цёплыя, дружалюбныя адносіны. Але тое, што ён паддаўся, пайшоў на повадзе ў гэтых крайніх нацыяналістычных сіл, — гэта дрэнна».

«ВАМ ТРЭБА ДАМОВІЦЦА»: ПРА ПАЛІТЫКУ ЗША АДНОСНА ЕС І КІТАЯ

«Шчыра кажучы, нам выгадна, што Злучаныя Штаты сутыкнуліся з Еўрасаюзам. Але паўстае пытанне з пункту гледжання амерыканцаў, а навошта вы робіце гэта такім чынам? Зрабіце гэта спакойна. Не трэба тут пыліць, не трэба ніякіх дымавых заслон. Гэта — вашы саюзнікі. Яны рабілі ўсё, што вы ім загадвалі».

«Што я параіў бы Трампу: не трэба ні з таго ні з сяго нападаць на Кітай. З Кітаем вам трэба дамовіцца. Я ведаю вельмі добра Кітай. На маіх вачах Кітай развіваўся.

Вы Кітай не спыніце. Гэта не мы, не Расія. Гэта Кітай. Там народ заточаны, паўтара мільярда чалавек заточаны абараняць да апошняга Кітай. Дамоўцеся з кітайцамі. Гэта будзе ў інтарэсах усёй планеты».

«Магу абсалютна дакладна сказаць: Сі Цзіньпін не тое што вайны не хоча, ён не хоча ніякага абвастрэння адносін. Яму не трэба канфрантацыя. Гэта ў крыві ў кітайцаў. Яны ціха, спакойна будуць нешта рабіць, яны разумеюць, што ў гэтай цішыні могуць мець поспех. І маюць поспех. Яны ніяк не прымаюць вайны».

«ВЫ ІХ ШТУРХНУЛІ Ў АБДЫМКІ»: ПРА ЕДНАСЦЬ РАСІІ З КІТАЕМ

«Хто аб'яднаў Расію з Кітаем? Вы (ЗША. — **Заўв. рэд.**) іх штурхнулі ў абдымкі. Калі ў мяне быў Болтан і Пампеа, я ім адкрыта задаў пытанне: што вы робіце? Навошта вы даймаеце Расію? Вы Расію штурхаеце ў абдымкі Кітая. І калі такая магутная ў ваенных адносінах ядзерная дзяржава, роўная ЗША, аб'яднаецца з такой магутнай дзяржавай, якой з'яўляецца Кітай у эканамічных адносінах, вы нічога з гэтым саюзам, з гэтым альянсам не зробіце».

Фота БелТА.

«Калі вы будзеце націскаць на Расію, каб сапсаваць адносіны Расіі з Кітаем, гэта ні да чаго не прывядзе. Наадварот, прывядзе да большай еднасці гэтых дзяржаў».

«КАБ ПЛАНЕТА БЫЛА Ў РАЎНАВАЗЕ»: ПРА МАГЧЫМАСЦЬ САЮЗА ПАМІЖ ЗША І РАСІЯЙ

«ЗША — гэта першая краіна ў свеце, высокатэхналагічная, багатая. Яны здольны на многае. Гэта ў Расіі разумеюць. І Расія будзе імкнуцца наладзіць вельмі добрыя адносіны са Злучанымі Штатамі Амерыкі».

«Для таго каб планета была ў раўнавазе, каб не было вось гэтых незразумелых войнаў, як на Блізкім Усходзе або ва Украіне, канфліктаў каб не было, саюз Расіі і Злучаных Штатаў магчымы і вельмі важны.

Саюз для эканамічнага развіцця. Ён магчымы і важны. Гэта будзе на перспектыву».

«ДЗВЕРЫ АДЧЫНЕНЫ Ў РАСІІ»: ПРА СПРЭЧКІ ВАКОЛ РЭДКАЗЯМЕЛЬНЫХ МЕТАЛАЎ

«Грошы робяцца ў цішыні. Навошта гэты шум? Па-першае. Па-другое, калі пачалася гэта вайна, што, дамаўляліся аб тым, што ўзамен за пастаўкі зброі, падтрымку Зяленскі аддасць рэдказямельныя металы? Аб гэтым размовы не было. Дык чаго сёння з яго патрабаваць?»

«Вы цяпер спрачаецеся з Украінай па рэдказямельных металах і гэтак далей. Слухайце, у Расіі (другое месца ў свеце займае Кітай) першае месца. Там гэтых рэдказямельных матэрыялаў у больш даступнай форме дастаткова. Супрацоўнічайце з Расіяй — вы атрымаеце каласальны ад гэтага эфект. Расія менш будзе мець эфект, але вы атрымаеце для развіцця каласальны эфект. Таму чаго вы ў акно спрабуеце залезці ва Украіну? Дзверы адчынены ў Расіі, супрацоўнічайце».

«Што датычыцца гэтых рэдказямельных матэрыялаў, я пытанне ўзняў (у размове з Прэзідэнтам Расіі. — **Заўв. рэд.**), гавару: дзіўна неяк — амерыканцы патрабуюць ад Украіны аддаць ім найважнейшае тое, што ў іх ёсць. Размова ж не толькі аб рэдказямельных матэрыялах ідзе ў ЗША. Ідзе размова аб прыродным газе, аб нафце, аб лагістыцы (партах) і гэтак далей. Тут жа больш шырокае пытанне. І я Пуціну выклаў сваю пазіцыю вось у такім рэчышчы. На што ён сказаў, што «амерыканцы ломяцца ў адчыненыя дзверы, гэта ёсць усё ў Расіі, мы можам з імі дамовіцца і працаваць». А потым публічна гэта агучыў».

«Я не абмяркоўваў з Расіяй і з Пуціным гэтыя пытанні. Мы абмяркуем гэта пытанне. Але, хутчэй за ўсё, гэта можа насцярожваць, калі Расія адчуе, што гэтыя дамоўленасці (магчымае пагадненне паміж ЗША і Украінай. — **Заўв. рэд.**) будуць выходзіць за рамкі эканамічных адносін. Калі гэта будзе толькі эканоміка, не звязаная з ваенна-прамысловым комплексам, зброяй, узброенымі сіламі, чаму б і не? Расія спакойна будзе працаваць».

«ШМАТ ЖА ІНШЫХ МЕТАДАЎ»: ПРА ГАТОЎНАСЦЬ БАКОЎ НАЦІСНУЦЬ «ЧЫРВОНУЮ КНОПКУ»

«Я не думаю, што Пуцін быў пастаўлены ў такую сітуацыю, што яму трэба было націскаць «чырвоную кнопку». Прынамсі (мы непасрэдна не абмяркоўвалі гэта пытанне, але ўскосна мы ж бачылі, да чаго ўсё ідзе), ніколі Пуцін не гаварыў аб тым, што ён гатовы да крайніх мер. Я не думаю, што ён гатовы. Ён настолькі быў гатовы націснуць «чырвоную кнопку», наколькі вы ў Злучаных Штатах Амерыкі, у Англіі або Францыі былі да гэтага гатовы. Ведаю, вы да гэтага не былі гатовы. Гэтак жа не быў гатовы да гэтага і Пуцін».

«Чыста па-чалавечы я чаму задаволены, што выбралі Трампа ў той сітуацыі, калі сапраўды мы пачалі ўжо гаварыць пра ядзерную вайну. У Трампа вялікая сям'я. У Трампа вельмі шмат маленькіх дзяцей, унукаў. У яго з Мелані Трамп сын яшчэ зусім малы, мусіць, гадоў 20. Ён, напэўна, аднагодак з маім малодшым сынам, і нечым падобныя яны адзін да аднаго. Таму я рады, што яго выбралі, таму што ў яго ёсць дзеці і ён, я бачу, вельмі любіць сваю сям'ю, вялікую сям'ю. Сваіх дзяцей, унукаў і гэтак далей.

А чалавек з любоўю да дзяцей і да сям'і, мне здаецца, ніколі не націсне на «чырвоную кнопку».

«Шмат жа іншых метадаў: і дыпламатычных, і сілавых, звычайная зброя і гэтак далей. Той жа «Арэшнік» і іншае. Ніхто не будзе хапацца за ядзерную кнопку. Аднак калі пагроза будзе надзвычайная, дык на тое і існуе гэтая зброя, каб яе прымяніць. Гэтак жа зробяць і Злучаныя Штаты Амерыкі».

«ЗА ГЭТА МНЕ НЕПУБЛІЧНА ДЗЯКАВАЛІ»: ПРА МЯЦЕЖ ВАГНЕРАЎЦАЎ І ВЫСОКУЮ АЦЭНКУ З БОКУ ЦРУ І MI-6

«Мае дзеянні былі ацэнены Захадам у тым ліку, што мяне здзівіла. Нават ЦРУ і MI-6, іншыя спецслужбы гэта вельмі высока ацанілі. Чаму? Аб гэтым не прынята публічна гаварыць. Але Захад гэта заўважыў, я тады таксама гэта адчуў, але ўжо калі працэс пачаўся: Жэня Прыгожын ірваўся да ядзернай кнопкі. І заходнікі дапускалі, што ў той перыяд ён можа звергнуць існую ўладу і захапіць ядзерную зброю. Вось за гэта вы мне непублічна дзякавалі».

«ТОЛЬКІ Ў САЮЗЕ З РАСІЯЙ»: ПРА ЎМОВЫ РОСКВІТУ ЕЎРОПЫ

«Будучыня Еўропы магчыма была добрай толькі ў саюзе з Расіяй. Калі б еўрапейцы, Еўрапейскі саюз устанавіў добрыя, нармальныя адносіны хоць бы ў эканоміцы з Расіяй, яны працвіталі б... І ці будзе зноў Амерыка вялікай, калі будзе моцным Еўрасаюз, — пытанне. Еўрасаюз — гэта таксама канкурэнт у эканамічных адносінах Злучаных Штатаў Амерыкі. Таму адзінства Еўрасаюза і Расіі, напэўна, не зусім выгадна было для Злучаных Штатаў Амерыкі».

«Мне здаецца, што, нягледзячы на тую незразумелую палітыку, якую праводзіць Еўрапейскі саюз, там знойдуцца разважлівыя людзі, якія змогуць захаваць Еўрапейскі саюз і наладзіць адносіны, у тым ліку і з намі, з Расіяй».

«Што датычыцца еўрапейцаў, мы жывём на адным кантыненце.

Беларусь з'яўляецца цэнтрам Еўропы. У нас у Полацку — цэнтр Еўропы. Гэта значыць Беларусь — сэрца Еўропы. Адсюль усё вынікае. Таму я магу сказаць, як у нас часта гавораць: «Давайце жыць дружна».

Паглядзіце: вакол такая прыгажосць, і гэта створана нашымі рукамі. І не толькі нашымі, але і Госпадам. Давайце гэта захаваем для дзяцей, гэта галоўнае, і для мяне ў тым ліку».

«АБМЯРКУЕМ УСЕ ПЫТАННІ Ў ДЭТАЛЯХ»: ПРА ЗАПЛАНАВАНЫ ВІЗІТ У РАСІЮ

«Праз тыдзень мы з ім (Уладзімірам Пуціным. — **Заўв. рэд.**) сустрэнемся ў Маскве і вельмі падрабязна і дэталёва пагаворым па ўсіх пытаннях. Па тэлефоне мы на гэта і спасталіся, што сустрэнемся і абмяркуем усе пытанні ў дэталях».

Паводле БелТА.

МЕРКАВАННІ

«ПАЦВЯРДЖЭННЕ КУРСА НА АДКРЫТАСЦЬ НАШАЙ КРАІНЫ ЗНЕШНЯМУ СВЕТУ»

Эксперты — аб інтэрв'ю Прэзідэнта блогеру сацсеткі X

Амерыканскі блогер Марыа Наўфал, які ўзяў у Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі паўтарагадзіннае інтэрв'ю, зрабіў справядлівую выснову аб тым, што беларускі лідар — унікальны і вельмі моцны палітык, які шчыра жадае міру. Пра гэта разважаюць нашы эксперты.

«ЯНО КЛАСНАЕ, ДАЕ АДКАЗЫ НА МНОГІЯ ПЫТАННІ»

У эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» **міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ** адзначыў, што ў сваім рэзанансным інтэрв'ю Аляксандр Лукашэнка агучыў пасылы, з якімі беларусы добра знаёмыя:

— Але нам патрэбны быў прарыў на амерыканскую і сусветную аўдыторыю. Першыя каментарыі, якія пайшлі ноччу, паказалі, што амерыканскія карыстальнікі не ведаюць, хто справакаваў Расію на канфлікт, хто спрыяў блакіроўцы мірных пагадненняў.

На думку Марата Маркава, выбар інтэрв'юера быў вельмі правільным:

— Марыа Наўфал, па-першае, малады чалавек — яму 30 гадоў, па-другое — паспяховы, па-трэцяе — прадстаўнік новай фармацыі бізнесменаў. Актыўны, дасведчаны, з добрай адукацыяй, які сустракаецца з лідарамі краін, мільярдэрамі. У сацыяльнай сеткі X досыць маладая і актыўная аўдыторыя — гэтыя людзі прасоўваюць бізнес, спрыяюць прыняццю важных рашэнняў, у тым ліку палітычных. Праграма Марыа Наўфала «Круглы стол» у X мае шматмільённыя прагляды. Вельмі важна, як амерыканскі блогер ахарактарызаваў інтэрв'ю з нашым Прэзідэнтам. Ён назваў Аляксандра Лукашэнку ўнікальным, наймагутнейшым палітыкам і выказаў перакананасць у тым, што свет павінен пра яго ведаць. Блогер перакануецца ў тым, што беларускі лідар шчыра хоча міру і заўсёды пра гэта казаў. Паслядоўнасць крокаў нашага Прэзідэнта вельмі важная.

Марат Маркаў заклікаў абавязкова паглядзець рэзанансны інтэрв'ю:

— Яго не соромна рэкламаваць, таму што яно класнае, дае адказы на многія пытанні і бачанне Прэзідэнта.

ПРЫКМЕТА САПРАЎДНАГА НЕЗАЛЕЖНАГА ЛІДАРА

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Дзмітрый БАСКАЎ, у сваю чаргу, адзначыў:

— Інтэрв'ю кіраўніка дзяржавы амерыканскаму блогеру Марыа Наўфалу чарговы раз прадэманстравала, што Аляксандр Рыгоравіч — чалавек шчыры і смелы. Наш прэзідэнт не баіцца называць рэчы сваімі імёнамі, адкрыта гаворыць аб існуючых праблемах і, самае галоўнае, дэманструе гатоўнасць і здольнасць іх вырашаць. Калі б усе сусветныя лідары былі таксама сумленныя ў сваіх словах і рашэннях, упэўнены, што многіх канфліктаў атрымалася б пазбегнуць ці хаця б мінімізаваць іх наступствы. Мы ўбачылі сумленныя адказы нават на нязручныя пытанні — гэта і ёсць прыкмета Сапраўднага незалежнага лідара: гатоўнасць адказваць за свае словы і рашэнні.

КЛЮЧАВЫЯ СЭНСЫ — ЗАКЛІКІ ДА НАРМАЛІЗАЦЫІ БЕЛАРУСКА-АМЕРЫКАНСКІХ АДНОСІН

— Інтэрв'ю Прэзідэнта амерыканскаму блогеру Марыа Наўфалу пацвярджае курс на адкрытасць нашай краіны знешняму свету, — звяртае ўвагу **аналітык аддзялення БІСД па Брэсцкай вобласці Сяргей ЖУК.** — Мы працягваем выкарыстоўваць усе магчымасці, у тым ліку і новыя медыя, для артыкулявання пазіцыі на міжнароднай арэне. Для нас першасны не столькі фармат або пляцоўка для камунікацыі, колькі перспектывы данясення да аўдыторыі сістэмаўтваральных для Беларусі сэнсаў.

Аналітык звярнуў увагу на тое, хто менавіта выступіў інтэрв'юерам:

— Марыа Наўфал з'яўляецца не проста паспяховым бізнесменам і публічнай персонай, але чалавекам, які, паводле ацэнак шэрагу СМІ, звязаны з Іланам Маскам. Яго падкаст «69 хвілін» з'яўляецца адным з папулярных сярод прыхільнікаў кансерватыўнай партыі медыяпрадуктаў. Таму можна з упэўненасцю сказаць, што пасылы Прэзідэнта Беларусі накіраваны не толькі на амерыканскае грамадства, але і на палітычныя эліты ЗША.

Падзяліўся аналітык і яшчэ адным назіраннем. У адрозненне ад папярэдніх інтэрв'ю, якія Аляксандр Лукашэнка даваў заходнім СМІ, цяперашні дыялог ашаламляльна адрозніваўся танальнасцю інтэрв'юера, яго жаданнем зразумець пазіцыю Беларусі і погляд на глабальныя геапалітычныя працэсы.

— Ключавымі сэнсамі інтэрв'ю сталі заклікі Прэзідэнта Беларусі да нармалізацыі беларуска-амерыканскіх адносін, сумеснага руху Усходу і Захаду наперад, знікнення ўзроўню эскалацыі на сусветным узроўні, перш за ўсё за кошт вырашэння ўкраінскага крызісу. Першым крокам павінна стаць спыненне агню і пачатак паўнавартасных мірных перагавораў. Прычым у сувязі з культурнай блізкасцю беларусаў, расіян і ўкраінцаў у якасці пляцоўкі зноў прапанаваны Мінск, — звярнуў увагу Сяргей Жук.

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю актуалізаваў пазіцыю Беларусі аб неабходнасці паскарэння фарміравання новай сістэмы міжнароднай бяспекі, якая б адлюстроўвала баланс сіл, што склаўся ў свеце, і ўключала ў сябе інтарэсы малых і сярэдніх дзяржаў.

— Несумненна, ключавую ролю ў гэтым павінны адыграць моцныя гэтага свету — Расія, ЗША і Кітай. Меседж Прэзідэнта аб Беларусі як аб адказным суб'екце міжнародных адносін, еўрапейскай краіне, апоры традыцыйных каштоўнасцяў і адным з цэнтраў хрысціянскай цывілізацыі адлюстроўвае наша пазіцыянаванне на міжнароднай арэне, што важна ў тым ліку для дзеючага кіраўніцтва ЗША, — падкрэсліў аналітык аддзялення БІСД па Брэсцкай вобласці.

«ЛУКАШЭНКУ ЧУЮЦЬ НА ЗАХАДЗЕ»

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Сяргей РАЧКОЎ адзначыў:

— Заўсёды заўважаюць інтэрв'ю нашага Прэзідэнта, асабліва прафесіяналы, якія займаюцца пытаннямі міжнароднай палітыкі, і абсалютна ўсе лідары вядучых дзяржаў Захаду. Інтэрв'ю для амерыканскага блогера ў першую чаргу разышлося па ўсіх сацыяльных сетках. Наколькі я ведаю, за некалькі гадзін яно набрала пад мільён праглядаў. І вельмі шырокія станоўчыя водгукі людзей з усяго свету. Гэтыя водгукі датычацца тых тэм, якія заходнія СМІ трактавалі не так, як варта было б, фактычна ўводзячы ў зман заходнюю грамадскасць.

Шырокая тэматыка, якую закрануў Прэзідэнт.

— І, самае галоўнае, яна актуальная не толькі для Еўропы, але і для ЗША, і глабальнага Поўдня ў тым ліку, — адзначыў парламентарый. — Прэзідэнт Беларусі трымае тую лінію, якую ён яшчэ пазначыў і да пачатку ваеннай фазы канфлікту, і калі ўжо пачалася СВА. Рэспубліка Беларусь прадставіла сваю тэрыторыю для правядзення трох раўндаў перагавораў і фактычна была пасрэднікам паміж Расіяй і Украінай. І цяпер Прэзідэнт Беларусі бачыць, што ў Трампа ёсць імкненне спыніць гэты канфлікт і вырашыць усе спрэчныя пытанні мірным дыпламатычным метадам. Пляцоўкай для абмеркавання, для мірных перагавораў можа стаць Беларусь, Мінск.

Парламентарый упэўнены, што інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі ўжо чуюць і яно будзе яшчэ доўга абмяркоўвацца.

— Насамрэч не так шмат сёння сусветных палітыкаў выказваюцца па гэтай тэме. Акрамя таго, мала такіх палітыкаў, якія моцна паглыбляюцца ў тэматыку гэтага канфлікту і разумеюць, што адбываецца і паміж Расіяй і Украінай, у цэлым у Еўрапейскім рэгіёне. Аляксандр Рыгоравіч аналізуе і прапаноўвае свае рашэнні па многіх еўрапейскіх праблемах ужо вельмі даўно, і ўсе яго прагнозы, як паказвае жыццё, апраўдваюцца.

Па паведамленнях нашых карэспандэнтаў і БелТА.

СОЦЫУМ

НІШЫ РОСТУ ІНФАРМАСЯРОДДЗЯ

Работа з калектывамі прыватных кампаній, развіццё лічбавых фарматаў і «жывая» работа з моладдзю

Вынікі работы ідэалагічнай вертыкалі падвялі на Гомельшчыне. З актывам рэгіёна ў рамках калегіі камітэта ідэалагічнай работы і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама сустрэўся намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Пярцоў.

Па ацэнцы спікера, пэўныя поспехі і дасягненні па выніках мінулага года відавочныя. Разам з тым ідэалагічная работа ў электаральны час выявіла пункты для далейшага росту.

— Неабходна крыху перафарматаваць нашу ідэалагічную работу. Больш завастраць яе на вынік, канкрэтны кантакт з рознымі мэтавымі групамі нашых грамадзян. Працаваць не толькі з актывам, з якім зручна, камфортна ўзаемадзейнічаць, але і ісці ў тыя калектывы, мэтавыя групы, «куды не ступала нага ідэолага». Гэта і індывідуальныя прадпрымальнікі, і прыватныя прадпрыемствы. Гэта сустрэчы па месцы жыхарства з тымі грамадзянамі, якія вядуць хатнюю гаспадарку, не задзейнічаны ў эканоміцы, але, натуральна, гэта нашы грамадзяне, удзельнічаюць ва ўсіх грамадскіх працэсах, выбарах дэпутатаў і Прэзідэнта нашай краіны, і не захопліваць іх нашай работай нельга, — лічыць Уладзімір Пярцоў.

Па словах спікера, ідэалагічнаму актыву сёння важна сфакусіравацца і на ацэнцы вынікаў сваёй працы, усталяванні кантакту, ахопе пазначаных мэтавых груп. Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта заклікаў ідэолагаў рэгіёна больш актыўна прымяняць новыя метады ўзаемадзеяння, у тым ліку лічбавыя платформы.

— У кантэксце атрымання інфармацыі, групавой камунікацыі трэба ствараць такія групы на лічбавых платформах, каб па любых пытаннях — камунальных, бытавых, сацыяльных — людзі звярталіся ў такія групы, якія будуць мадэравацца органамі ўлады або СМІ на месцах, — звярнуў увагу спікер.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта нагадаў, што апаненты беларускай дзяржаўнасці для дасягнення стратэгічных і геапалітычных мэт не паслабляюць прапагандысцкую работу.

— У першую чаргу «нацэльваюць свае штыкі» на наша маладое пакаленне, на тых, хто цяпер яшчэ вучыцца ў школе, ССНУ, ВНУ, тых, хто ў 2030 годзе павінен будзе прыйсці на выбарчыя ўчасткі, аддаць свой голас. Гэта для іх прынцыповая таргетаваная аўдыторыя. Яны вельмі ўважліва яе вывучаюць, бо моладзь цалкам знаходзіцца ў лічбавым асяроддзі, сацыяльных сетках, месенджарах... Тут нам таксама важна засяродзіцца, — падкрэсліў Уладзімір Пярцоў.

Ён нагадаў аб галоўнай перавазе ідэалагічнага актыву — уменні працаваць твар у твар, эфектыўна выбудоўваць сустрэчы, дыялогі.

— Сустрэчы павінны праходзіць не проста як выступленне лектара, а рэальна двухбаковы трафік, дыялог паміж тым, хто выступае і аўдыторыяй, — перакананы спікер.

Уладзімір Пярцоў заклікаў ідэалагічны актыў, масмедыя адэкватна рэагаваць, лідзіраваць і дамінаваць у інфармацыйным полі краіны.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

АКТУАЛЬНА

САЎМІН ЗАЦВЕРДЗІЎ ФІНАНСАВАННЕ НА БУДАЎНІЦТВА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА МУЗЕЯ БЕЛАРУСІ

Савет Міністраў удакладніў пералік будоўляў і аб'ектаў Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы на 2025 год. Адпаведная пастанова № 127 ад 3 сакавіка апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале, паведамляе БелТА.

Згодна з дакументам, на будаўніцтва Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі ў раёне вул. Арлоўскай у Мінску выдзеляць 6 мільёнаў рублёў сродкаў дзяржаўных капітальных укладанняў. Фінансаванне ахопіць праектныя і вышукальныя работы.

Міністэрству эканомікі даручана ўлічыць аб'ект пры карэкціроўцы Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы, а Міністэрству фінансаў — накіраваць прадугледжаныя сродкі з рэспубліканскага бюджэту.

ДА СЯЎБЫ ГАТОВЫЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Усяго запланавана апрацаваць 1,9 мільёна гектараў зямель, з якіх 1,5 мільёна зоймуць збожжавыя культуры, а больш за 400 тысяч гектараў — азімы рапс. У рамках яравой сяўбы аграрыям трэба пасеяць 600 гектараў ранніх яравых культур, 330 тысяч гектараў кукурузы на зерне і каля 900 тысяч гектараў гэтай культуры на кармавыя мэты.

На плошчы больш за 100 тысяч гектараў будзе праведзена сяўба цукровых буракоў. З гэтых палёў разлічваюць атрымаць каля пяці мільёнаў тон караняплодаў. На 50 тысячах гектараў будзе вырошчвацца лён-даўгунец, а таксама бульба і агародніна, каб забяспечыць патрэбнасці насельніцтва ў так званым наборы для баршчу. Гэта дасць магчымасць не толькі задаволіць унутраны попыт, але і стварыць патэнцыял для экспарту і атрымання валюты.

Асобныя сельскагаспадарчыя арганізацыі Брэсцкай вобласці пачынаюць сяўбу аднагадовых культур, а дзесьці — ранніх яравых, у першую чаргу аўса. Ва ўсіх рэгіёнах краіны арганізацыі ўжо прыступаюць да сяўбы шматгадовых траў.

БОЛЬШАСЦЬ НАСЕННЯ — УЛАСНАЙ СЕЛЕКЦЫІ

Усе неабходныя аб'ёмы насення для запланаванай пасяўной па збожжавых культурах ужо засыпаны і закладзены страхавы фонд. Сёлета падрыхтавана 27 тысяч тон насення кукурузы, што складае 71 % ад патрэб краіны. Імпарт насення гэтай культуры таксама склаў больш за сем тысяч тон, што гарантуе поўнае забеспячэнне насенным матэрыялам на запланаваных плошчах.

Цалкам падрыхтавана насенне лёну-даўгунцу, яно практычна на 100 % айчыннай селекцыі. А вось па цукровых бураках сітуацыя складаней. У гэты сезон ёсць толькі 5 % «салодкага» насення з беларускай прапіскай, астатняе даводзіцца завозіць. На сёння пацверджана наяўнасць 117,5 тысячы высяўных адзінак, што складае 91 % ад патрэбы. Пры гэтым, дзякуючы імпарту, забяспечанасць насеннем ужо дасягнула 96 %.

ТЭХНІКА І ПАЛІВА — У НАЯЎНАСЦІ

Як адзначыў Мікалай Лешык, сёлета назіраецца станоўчая дынаміка ў тэмпах падрыхтоўкі тэхнікі. У цэлым па краіне тэхніка падрыхтавана на 95 %. Маецца больш чым 33 тысячы трактароў, звыш сямі тысяч з іх — энерганасычаныя. Іх гатоўнасць складае больш за 93 %. Завяршаюцца асобныя рамонты найбольш складаных механізмаў. «Па запэўненнях і пастаўшчыкоў запчастак, і нашых агрэсэрвісаў рамонт тэхнікі, асабліва трактарнай, будзе завершаны ў найблізжэйшыя два-тры дні», — заўважыў Мікалай Лешык.

Па пасяўных глебаапрацоўчых агрэгатах гатоўнасць па краіне складае 93 %. Паводле слоў спецыяліста, гэтага больш чым дастаткова, каб у аптымальныя тэрміны правесці сяўбу ранніх збожжавых культур. Гатоўнасць машын для ўнясення мінеральных угнаенняў — больш за 95 %. Тэмпы назапашвання мінеральных угнаенняў вышэй за леташнія практычна на 25 %.

Пралічаны варыянты забеспячэння сельскагаспадарчых арганізацый палівам. Частка гаручага будзе запазычаная з матэрыяльнага рэзерву з прадастаўленнем растэрміноўкі. Гэта падтрымка дзяржавай сельскагаспадарчых арганізацый. Таксама выдзяляецца больш за 128 тысяч тон безакцызнага паліва, гэта значыць па больш нізкай цане.

Адказваючы на пытанне аб кадрах, Мікалай Лешык адзначыў, што ў гэты сезон дапамагаць вяскоўцам сеяць будуць і зусім маладыя работнікі. Хлопцы, якія дасягнулі сямнаццацігадовага ўзросту, атрымалі права на кіраванне самаходнымі машынамі сельскагаспадарчага прызначэння, а таксама коламі трактарамі.

Сяргей КУРКАЧ.

ПА-ДЭПУТАЦКУ, ПА-ЖАНОЧЫ

ЗА АГАРОДЖАЙ УЛАСНАГА СТРАХУ



Мінула ўжо амаль чатыры гады, як палякі задумалі, а пасля і рэалізавалі ідэю ўстаноўкі агароджы на граніцы з Беларуссю. Рабілі гэта нібыта дзеля таго, каб паставіць заслон на шляху мігрантаў, якія ішлі да іх з боку Беларусі. Але ўжо сёння добра відаць адзіны вынік з гэтага распіяранага дзейства — вялікая шкода самаму старому лесу Еўропы, яго флоры і фаўне.

Польскі плот, даўжыня якога складае больш за 185 кіламетраў, з іх больш за 55 кіламетраў менавіта ў Белавежскай пушчы, з вышынёй каля пяці метраў ужо нанёс, не пабаюся сказаць, незаменную страту рэліктаваму лесу.

Акрамя таго, варта ўсім нагадаць, што Белавежская пушча — аб'ект сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, аднак і гэта палякаў не спыняла. Для іх закон — не закон, паколькі літаральна з пенай ля рота яны і сёння даказваюць, што нарматыўныя прававыя акты прыродаахоўнай накіраванасці не распаўсюджваліся на будаўніцтва гэтай загароды.

Затое боль нашых навукоўцаў-біёлагаў проста крычыць. Яны яшчэ падчас праектавання не проста папярэджвалі аб страшных наступствах будаўніцтва гэтага жалезабетоннага монстра-плота на граніцы Польшчы і Беларусі, а літаральна білі ў набат.

Але калі гэта спадчына ЮНЕСКА, то хто, як не яны самі, павінен даць ацэнку такім дзеянням? І далі. ЮНЕСКА ўбачыла і рэальна ўсвядоміла маштаб трагедыі, акрамя таго, прыняла рашэнне аб накіраванні маніторынгавай групы. Яшчэ летась такая група працавала. Не лішнім будзе заўважыць, што наша Мінпрыроды запрашала і польскі бок паўдзельнічаць у працы місіі на нашай тэрыторыі, і мы былі гатовыя выехаць на польскі бок Белавежскай пушчы. Аднак палякі не адгукнуліся. А навошта? Бо агароджу яны не знясуць, паколькі каманды няма і наўрад ці будзе, не для таго яе ставілі за «касмічныя» сродкі, а гэта больш чым 370 мільёнаў долараў, каб зносіць.

Але, акрамя нанесенай шкоды экалогіі, не будзем забываць аб людзях, якія гінуць побач з гэтай агароджай. Як паказваюць шматлікія відэазапісы, яна зусім не стала для іх перашкодай: мігранты за лічаныя хвіліны пераадольваюць яе з дапамогай няхітрых інструментаў, а то і без іх. Некаторым шанцуе, некаторых ловяць польскія «загранатрады», якія збіваюць, калечаць няшчасных людзей і выкідваюць іх памяраць на нашу тэрыторыю. З моманту ўзвядзення агароджы, а гэта 2021 год, знявечаныя целы амаль трох дзясяткаў мігрантаў знайшлі нашы пагранічнікі.

Калі ўзведзены за шматмільённыя сродкі плот фактычна не выконвае свае ахоўныя функцыі, узнікае простае, але слушнае пытанне: навошта? Навошта губіць прыроду? Навошта здзекавацца з людзей? А адказ просты. Страх — галоўная перашкода, а палякі ўжо не ведаюць, як з гэтага тупіка выйсці.

А для нас усё проста: якая ні была б перашкода, заўсёды знойдзецца спосаб яе пераадолець, бо Беларусь платы не ставіць, граніцы не закрывае, і душа ў нас заўсёды адкрытая. Толькі з мірам прыходзьце.

Ірына ДАЎГАЛА,
намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.

У тэму

За мінулы год забяспечана станоўчая дынаміка развіцця аграпрамысловага комплексу. У поўным аб'ёме выкананы патрэбнасці ўнутранага рынку і асноўныя параметры харчовай бяспекі краіны, павялічаны экспартныя пастаўкі харчавання, адзначыў на калегіі ведамства намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН.

УРАДЖАЙНАСЦЬ ГОДНАЯ, АЛЕ МОЖНА ЛЕПШ

У нашай краіне летась забяспечана прыбаўка ў вытворчасці збожжавых і зернебабовых культур у дапрацаванай вазе больш за 674 тысячы тон пры сярэдняй ураджайнасці 33,9 ц/га, што на 0,6 ц/га вышэй за 2023 год, рапсу — больш за 143 тысячы тон пры сярэдняй ураджайнасці 24,8 ц/га, што таксама больш на 1,7 ц/га да ўзроўню папярэдняга года. Разам з тым Уладзімір Гракун зрабіў упор на тое, што вынік мог быць яшчэ лепшым.

Фактычныя заданні па вытворчасці збожжа і рапсу летась выканалі Брэсцкая, Гродзенская і Мінская вобласці, цукровых буракоў — Віцебская і Гродзенская, ільновалакна — Брэсцкая, агародніны — Брэсцкая, Віцебская і Мінская, пладоў і ягад — Брэсцкая вобласць.

Уладзімір Гракун дадаў, што ўсе неабходныя рашэнні на ўзроўні кіраўніка дзяржавы і ўрада па фінансаванні сельгасвытворцаў прынятыя. Бюджэтныя крыніцы акумуляваныя ў мясцовых бюджэтах. Льготныя крэдыты даступныя пры належнай дысцыпліне іх вяртання. Для рэсурснага забеспячэння палявых работ сёлета павінны быць максімальна задзейнічаны ўласныя сродкі арганізацый.

Прапрацоўваюцца пытанні павелічэння рэсурснай базы льготнага крэдытавання на 400 мільёнаў рублёў і павелічэння бюджэтнага фінансавання на суму 200 мільёнаў рублёў для закупкі сельгасарганізацыямі гаруча-змазачных матэрыялаў.

ЭКСПАРТ ПРЫРОС МІЛЬЯРДАМ У ВАЛЮЦЕ

Аб'ём валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі за 2024 год склаў 36,3 мільярда рублёў з ростам да 2023 года 103,4 % у супастаўных цэнах. Забяспечана станоўчая дынаміка росту вытворчасці асноўных відаў сельскагаспадарчай прадукцыі: малака — 105 %, вырошчвання жывёлы і птушкі — 102,5 %, збожжавых і зернебабовых — 108,8 %, рапсу — 116 %, цукровых буракоў — 102,2 %. Аб'ёмы вытворчасці ў перапрацоўчай прамысловасці па ўсіх асноўных таварных пазіцыях у натуральным выражэнні таксама павялічыліся.

Нарошчванне аб'ёмаў вытворчасці дазволіла не толькі задаволіць патрэбы ўнутранага рынку, але і павялічыць экспарт харчовых тавараў і сельскагаспадарчай сыравіны на 14,4 %. Атрымана 8,5 мільярда долараў валютнай выручкі, што на 1 мільярд больш чым за 2023 год. Нягледзячы на санкцыйны ціск, пастаўкі харчавання вяліся ў 117 краін, уключаючы 19 дзяржаў — упершыню.

60 МАЛОЧНЫХ КОМПЛЕКСАЎ

У гэтым і наступным гадах запланавана фінансаванне будаўніцтва з дзяржаўнай падтрымкай, 60 малочнатаварных комплексаў у розных рэгіёнах краіны, адзначыў Уладзімір Гракун. У прыватнасці, ён заўважыў, што вынікі ў малочнай жывёлагадоўлі наўпрост звязаныя з удасканаленнем тэхналогіі вытворчасці малака за кошт мадэрнізацыі, рэканструкцыі і будаўніцтва малочнатаварных фермаў і комплексаў. Так, у мэтах выканання даручэння кіраўніка дзяржавы ў краіне ў 2023 годзе пачата маштабная работа па пераводзе дойнага статка на сучасныя ўмовы ўтрымання.

Летась са 101 аб'екта будаўніцтва або рэканструкцыі 64 — новыя будоўлі сучасных малочнатаварных комплексаў. Найбольшая іх колькасць размешчана ў Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцях. У гэтых жа рэгіёнах больш інтэнсіўна будуюцца і мадэрнізуюцца аб'екты спадарожнай інфраструктуры для ўтрымання маладняку буйной рагатай жывёлы і захоўвання кармоў.

У цэлым па краіне ўдзельная вага вытворчасці малака на малочнатаварных комплексах склала 77 % ад агульнага аб'ёму вытворчасці, а прадуктыўнасць дойнага статка сфарміравалася на ўзроўні 6739 кілаграмаў, што на 541 кілаграм вышэй за сярэдні паказчык па краіне. Лагічным у Мінсельгасхарчы лічаць і такі факт: у Брэсцкай вобласці, якая традыцыйна дэманструе адны з найлепшых паказчыкаў па надоях, 89 % кароў утрымліваецца на малочнатаварных комплексах з даільнымі заламі і робатамі.

PARITETBANK
ТВОЙ И ЦИФРОВОЙ

Открытое акционерное общество «Паритетбанк»

(Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а)

сообщает, что 26 марта 2025 г. в 11.30 часов
в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Паритетбанк»
будет проводиться годовое Общее собрание акционеров ОАО «Паритетбанк» в очной форме по адресу: Оздоровительный комплекс «Ислочь-Парк», Республика Беларусь, Минская область, Воложинский район, Раковский сельсовет, 24, 1.8 км западнее аг. Раков.

Повестка дня:

1. О счетной комиссии.
2. Об итогах деятельности ОАО «Паритетбанк» за 2024 год, в том числе о реализации Стратегического плана развития ОАО «Паритетбанк» на 2024 – 2026 годы.
3. Отчет о работе Наблюдательного совета ОАО «Паритетбанк» за 2024 год, в том числе о работе независимых директоров, о результатах внутренней оценки эффективности корпоративного управления ОАО «Паритетбанк».
4. О заключении Ревизионной комиссии ОАО «Паритетбанк» по результатам проведения ежегодной ревизии финансовой и хозяйственной деятельности ОАО «Паритетбанк» за 2024 год.
5. Об утверждении годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2024 год.
6. О распределении прибыли и выплате дивидендов за 2024 год, об использовании нераспределенной прибыли прошлых лет.
7. Об избрании Наблюдательного совета ОАО «Паритетбанк».
8. Об избрании Ревизионной комиссии ОАО «Паритетбанк».
9. Об определении размера вознаграждений и компенсации расходов членам Наблюдательного совета ОАО «Паритетбанк» и членам Ревизионной комиссии ОАО «Паритетбанк» за исполнение ими своих обязанностей.

Список лиц, имеющих право на участие в годовом Общем собрании акционеров ОАО «Паритетбанк», составляется на основании реестра акционеров ОАО «Паритетбанк», сформированного по состоянию на 3 марта 2025 г.

Лица, имеющие право на участие в годовом Общем собрании акционеров ОАО «Паритетбанк», могут ознакомиться с информацией (документами) по вопросам повестки дня собрания – с 24 марта 2025 г. по 25 марта 2025 г. с 9.00 до 13.00 часов по адресу: г. Минск, ул. Киселёва, 61а, каб. 317, а также 26 марта 2025 г. по месту проведения годового Общего собрания акционеров ОАО «Паритетбанк» при прохождении регистрации.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в годовом Общем собрании акционеров ОАО «Паритетбанк», будет проводиться 26 марта 2025 г. по месту проведения годового Общего собрания акционеров ОАО «Паритетбанк» с 10.50 до 11.20 часов при предъявлении документов, удостоверяющих личность (подтверждающих их полномочия).

Телефон для справок +37517 311 43 53

https://www.paritetbank.by

ОАО «Паритетбанк». УНП 100233809.
Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 13 февраля 2024 года № 5.

Уважаемые акционеры ОАО «Рапс»

28 марта 2025 года СОСТОИТСЯ ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Рапс»,

расположенного по адресу: Минская обл., Минский район, 223014, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20.

Собрание пройдет по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, административное здание ОАО «Рапс», первый этаж, актовый зал.

Повестка дня собрания

1. Отчет о работе наблюдательного совета в 2024 году.
2. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2024 году и основных направлениях деятельности Общества на 2025 год.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении предприятия (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2024 год. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2025 год и 1-й квартал 2026 года.
6. Об избрании членов наблюдательного совета Общества.
7. Об избрании ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, 20, с 7 марта 2025 года по 27 марта 2025 года с 14.00 до 16.00 в кабинете бухгалтерии либо 28 марта 2025 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – 28 марта 2025 г. в 11.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 1 марта 2025 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность, заверенную в установленном порядке!

Справки по тел.: 8 (017) 5166846, 8 (017) 5166824.

Наблюдательный совет ОАО «Рапс».

УНП 600068480

ОБЪЯВЛЕНИЕ

Вниманию акционеров ОАО «Белсолод»

Повестка дня годового общего собрания акционеров, которое состоится 21 марта 2025 года, дополнена вопросом: «О выплате дополнительно начисленных дивидендов и отчислений в фонд национального развития за 2023 год».

Наблюдательный совет.

УНП200075434

КАНЦЭНТРАВАНАЕ ПАЛІВА МЯСЦОВАГА ВЫРАБУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А вось для насельніцтва цана за аналагічны аб'ём гэтага драўнянага паліва сфарміравана на ўзроўні 50 рублёў за тону. Акрамя таго, з красавіка мінулага года катлы і гарэлкі беларускай вытворчасці, якія працуюць на пелетах, насельніцтва можа купляць на льготных умовах з атрыманнем спецыяльных крэдытаў пад 4 % гадавых. Таксама ў снежні мінулага года быў падпісаны ўказ, які прадугледжвае кампенсацыю грамадзянам да 40 % кошту кацельнага абсталявання для спальвання пелет.

Віталь Крэцкі асобна адзначыў, што на домаўладанне, як правіла, хапае тры тоны пелет на ўвесь ацяпляльны перыяд, гэта значыць, у 150 рублёў абыдзецца ацяпленне дома плошчай 100 квадратных метраў на працягу зімы.

«Такія ўмовы рэдкія. Прыродны газ каштуе даражэй, электраэнергія — таксама, — пракаментаваў эксперт. — Да таго ж, каб паставіць кацёл на пелетах, не трэба складаць праект. Так, рэгіструецца павышаны попыт на электраацяпленне. Аднак важна разумець: каб падаць у аддалены населены пункт электраэнергію для ацяплення, трэба мадэрнізаваць электрасеткавую інфраструктуру. У выпадку невялікай шчыльнасці прыватных дамоў гэта эканамічна немэтазгодна».

Дырэктар дэпартамента падкрэсліў, што ўнутраны рынак спажывае пелеты, выраблены з адходаў. Па такой тэхналогіі выпускаецца каля 300 тысяч тон паліўных гранул, і кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача ўвесь гэты аб'ём выкарыстоўваць унутры краіны. Пры гэтым за мяжу Беларусь можа пастаўляць не менш за 900 тысяч тон драўнянага паліва.

У пастаўках пелет могуць быць зацікаўлены дружалюбныя нам краіны блізкай дугі, аднак, як заўважыў Віталь Крэцкі, не адмовяць у Беларусі і пакупнікам з далёкага замежжа.

«У мінулым годзе да ўзроўню 2021-га спажыванне пелет у краіне павялічылася ў два разы. Насельніцтва летась выкарыстоўвала для энергаспажывання прыкладна на 370 тон драўняных паліўных гранул больш, чым у 2023 годзе. Як відаць, вынік ёсць, хоць буйных кацельняў на пелетах мы летась не ўводзілі. У асноўным рырост забяспечылі дробныя аб'екты, да 1 МВт. Гаворка ідзе пра школы, дзіцячыя садкі, бальніцы. Што важна, такі кацёл цалкам аўтаматызаваны і кіруецца з тэлефона. Адзін чалавек можа абслужыць да чатырох падобных катлоў», — падсумаваў Віталь Крэцкі.

З улікам пастаўленых задач Дэпартамент па энергаэфектыўнасці на наступных пяцігодках сфарміруе асобную падпраграму, якая стане ўключаць непасрэдна перавод нізкаэфектыўных катлоў на пелеты. У асноўным гэта аб'екты сацыяльнай інфраструктуры магутнасцю да аднаго мегавата. На сёння гэтых аб'ектаў парадку 86.

Працягваецца пошук тых месцаў, дзе спецыялісты могуць такія катлы паставіць. Гэта можа быць школа або бальніца ў вёсцы, дзе сёння жыве мала чалавек і дзе будаваць новую традыцыйную кацельню нявыгадна. Там нашы вытворцы паступаюць абдумана. Яны выпускаюць модульныя кацельні. Прывезлі на колах, паставілі кацельню, нават без падмуркаў практычна. Падводзяць ваду, кацельня працуе. Пасля пры неабходнасці кацельню перавозяць на іншае месца. Такім чынам забяспечваецца інфраструктура.

Сяргей КУРКАЧ.

Дарэчы

РАЗУМНАЯ «ПЕЧКА»

Спецыяльныя катлы на цвёрдым паліве, у тым ліку на пелетах, выраблюць у нашай краіне ў Мінску, у Гродне, Гомелі і ў Полацку. У залежнасці ад магутнасці і вытворцы такія катлы каштуюць ад 4 тысяч рублёў (самыя простыя) да 12 тысяч рублёў. Амаль усё гэта абсталяванне прапануецца ў крэдыт па сістэме «Родныя тавары» пад 4 % гадавых на тры гады.

Распальванне і падача пелет адбываецца аўтаматычна. Яшчэ адна асаблівасць у рабоце цвёрдапаліўнага катла — выкарыстанне GSM або Wi-Fi-модуля. Спажывец можа дыстанцыйна кантраляваць абсталяванне і кіраваць ім. Дастаткова мець пад рукой мабільны тэлефон. Пры выкарыстанні пелетных катлоў неабходна раз у 2-4 сутак запоўніць бункер палівам і забыцца пра паходы ў топачную. Кацёл сам усё зробіць.

Пры неабходнасці абсталяванне хутка пераключаецца паміж рознымі відамі паліва. Для гэтага чалавеку неабходна закласці ў топачную камеру дровы або брыкеты. Далей у настройках выбіраецца альтэрнатыўнае паліва. Тэхніка аўтаматычна прыпыняе падачу пелет. Калі паліва згарыць, сістэма зноў уключыць аўтаматыку падачы.

Дадатковым палівам для такіх катлоў служыць вугаль розных сартоў, драўніна і драўняныя матэрыялы, у тым ліку дровы, дранка, пілавінне, брыкетаваныя або грануляваныя драўняныя адходы, адходы сельскагаспадарчых перапрацоўчых вытворчасцяў, раслінныя адходы, збожжа, насенне, кукуруза, торф, у тым ліку фрэзерны і кускавы, брыкеты.

Аднак пелеты для насельніцтва зараз па цане, напэўна, найбольш прывабныя.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
6 САКАВІКА 2025 г.
№ 5 (15994)
Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Пакаленне XXI

ЧАС МАГЧЫМАСЦЯЎ ДЛЯ НОВЫХ ЗОРАК

Яркімі эмоцыямі расфарбаваў канец зімы фінал рэспубліканскага праекта «Студэнт года», які прайшоў у Мінскім гарадскім палацы культуры. На працягу ўсяго 2024-га каля 150 студэнтаў па ўсёй краіне ўдзельнічалі ў адборах спаборніцтва на базе ўстаноў вышэйшай адукацыі. Гэта і конкурс прамоўніцкага майстэрства, і абарона праектаў, і творчы нумар. Да таго ж усе ўдзельнікі павінны былі мець высокі сярэдні бал — не менш за «8», а таксама займаць актыўную жыццёвую пазіцыю, удзельнічаць у грамадскім жыцці ўніверсітэта і горада. У выніку ў фінал выйшлі 14 юнакоў і дзяўчат з Мінска, абласных цэнтраў, а таксама Баранавічаў і Наваполацка.

— Як вядома, час выбірае нас, а моладзь выбірае час. Менавіта пад гэтым слоганам праходзіць ужо 14-ы сезон праекта, упадабанага ўсімі без выключэння студэнтамі краіны. На працягу некалькіх месяцаў юнакі і дзяўчаты рыхтавалі свае творчыя нумары ў атмасферы адзінства, — адзначыў **першы сакратар ЦК ГА «БРСМ» Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ.**

Паводле яго слоў, «Студэнт года» — гэта праект, які дае магчымасць раскрыць творчыя таленты маладых людзей, і таму на працягу некалькіх гадоў пераможцы ўключаюцца ў фонд Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.

— Сёлета мы ўкаранілі новыя формы. Падчас інтэрактыўнай гульні ўдзельнікі прапаноўвалі свае рашэнні для папулярызацыі рабочых спецыяльнасцяў і рэалізацыі ініцыятыў у галіне інфармацыйных тэхналогій і штучнага інтэлекту. Гэта ўнікальная магчымасць прадэманстраваць ідэі не толькі ВНУ, але і ўсёй краіне, — дадаў ён.

Аляксандр Лук'янаў адзначыў, што ў год 80-годдзя Перамогі важным крытэрыем ацэнкі з'яўляецца ўзровень патрыятызму ў нумарах маладых людзей.

— Вядома, журы будзе ацэньваць удзельнікаў па паспяховасці, развіцці талентаў і творчасці. Упэўнены, гэта свята канкурсантам запомніцца, мы ўбачым новых зорачак студэнцкай аўдыторыі, — адзначыў перад пачаткам мерапрыемства першы сакратар ЦК ГА «БРСМ».

Усяго фінал уключаў два асноўныя конкурсы: «Візітная картка» і творчы конкурс «Код поспеху». А ўпрыгожылі шоу дэфіле, падчас якіх гледачам прадэманстравалі калекцыю эксклюзіўных касцюмаў, створаных спецыяльна да мерапрыемства маладым дызайнерам і мадэльерам Мікітам Захарчуком. Да таго ж напярэдадні асноўнага конкурснага дня фіналісты прайшлі інтэлектуальнае выпрабаванне, падчас якога трэба было дакладна і аргументавана адказаць на пытанні экспертаў на працягу 30 секунд. Удзельнікі таксама абаранялі свае праекты на «Студэнцкім хакатоне».

Асноўнай тэматыкай конкурсу ў 2025 годзе стаў «Час магчымасцяў». Так, скрозь прызму поспехаў кожнага асобна ўзятага студэнта неабходна было паказаць усе перспектывы росту, якія сёння ёсць у кожнага маладога беларуса.

Гэта ідэя счытвалася ў нумарах многіх удзельнікаў, сярод якіх быў і **студэнт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ефрасінні Полацкай Уладзіслаў ПРОЗАРАЎ.** Ён нават напісаў верш для творчага конкурсу.

— У вершы я расказваю пра перспектывы Беларусі. Аднойчы ў мяне з'явілася думка парэфлексаваць на гэтую тэму. У сучасным свеце моладзь часам не задумваецца аб тым, што краіна робіць для нас. У сваім вершы я хацеў паказаць Беларусь такой, якой адчуваю яе сам, каб іншыя таксама ўбачылі яе ва ўсіх фарбах, — адзначыў малады чалавек.

Здзіўляла сваёй неверагоднай энергетыкай, харызмай, а таксама новымі падыходамі **студэнтка БДЭУ Юлія КАВАЛЕНКА.** Яе візітная картка была прадстаўлена ў фармаце спецвыпуску навін, а творчы нумар уразіў прафесіяналізмам і відовішчнасцю.

— Асноўная ідэя ў тым, што мая гераіня — жанчына з разбітым сэрцам. Сімвал яе эмоцый — ружа ў азоце, якую я разбіла ў пачатку нумара. У танцы мы бачым яе пакуты і пошукі. Але ўсё заканчваецца добра, і ў фінале яна сустракае сапраўднае каханне. Фінальная кропка нумара — пялёсткі руж, якія зверху ляцяць на артыстаў. Такі прыём з тэхнічнага пункту гледжання на «Студэнце года» раней не выкарыстоўвалі, — падзялілася дзяўчына.

Яшчэ да пачатку конкурсу ў фіналісткі быў добры настрой:

— Я прачнулася і зразумела, што сёння еду скараць сцэну і заваёўваць любоў гледача.

І ў яе ўсё атрымалася. Па выніках усіх конкурсных выпрабаванняў менавіта **Юлія Каваленка стала «Студэнтам года». Другое месца дасталася студэнту Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Барысу Бараноўскаму. Трэцяе месца — студэнтцы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі Дар'і Васільевай.** А намінацыю **«Студэнт года ONLINE» атрымаў Аляксандр Івашчанка з Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.**

Лізавета ГОЛАД,
фота аўтара.

Узаемадзеянне

ЗА СПРАВУ БЯРЭЦЦА МОЛАДЗЬ

Фінал чацвёртага сезона рэспубліканскага праекта «Конкурс маладзёжных ініцыятыў» прайшоў у Маладзёжнай крэатыўнай прасторы ў Мінску. У 2024 годзе на конкурс паступіла каля 200 заявак з усёй краіны. Сярод прадстаўленых — праекты па патрыятычным выхаванні, развіцці творчасці, спорту, стварэнні адукацыйных праграм, крэатыўных прастор і не толькі. У нашым матэрыяле — пра некаторыя з іх.

Спаборніцтва для ўсіх і для лепшых?

Адбор праходзіў у некалькі этапаў: спачатку на раённым узроўні, потым на абласным або Мінскім гарадскім. Па выніках вызначылі 64 лепшыя праекты. Іх прадстаўнікі і атрымалі магчымасць прэзентаваць свае распрацоўкі на «рэспубліцы». Дарэчы, у 2024 годзе былі паспяхова рэалізаваны 23 праекты. На іх рэалізацыю выдзелілі 800 тысяч беларускіх рублёў.

З трэцяга сезона заслухоўванне ініцыятыў стала вочным. Такі падыход, на думку арганізатараў, дазваляе больш аб'ектыўна ацаніць праекты, адбор якіх ажыццяўляе Міністэрства адукацыі Беларусі. Арганізацыя самога конкурсу і каардынацыя рэалізацыі ініцыятыў даверана Беларускаму рэспубліканскаму саюзу моладзі.

Гуляй, развівайся, вучыся, натхняйся

Адна з прапанаваных на мерапрыемстве ініцыятыў — стварэнне ў парку «Школьны» г. п. Лёзна Віцебскай вобласці зоны для гульняў і камфортнага месца для адпачынку. Сам парк быў абсталяваны на пачатку 2000-х гадоў. У ім ужо ёсць сцэна, на якой рэгулярна праходзяць раённыя і абласныя фестывалі і канцэрты, але не хапае спецыяльнай прасторы для моладзі. Менавіта з гэтай прычыны быў прапанаваны праект пад назвай «Дето Мир»:

— Зрабіць наш раён больш прывабным для моладзі, стварыць умовы, у якіх ім захочацца заставацца, развівацца і ствараць сем'і — вось галоўная ідэя нашай ініцыятывы, — падзялілася **Анастасія ДУЛУБ, педагог сярэдняй школы імя М. В. Акцябрскай г. п. Лёзна.** — А прымеркаваць наш праект мы хочам адразу да дзвюх важных дат — 80-годдзя з дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і 500-годдзя раёна.

Таму асаблівасцю зоны адпачынку стануць інтэрактыўны падыход і патрыятычны ўхіл: на пляцоўцы будуць размешчаны QR-коды, якія дазволяць наведвальнікам у гульнявой форме знаёміцца з гісторыяй сваёй малой радзімы. Прапануецца таксама ўстаноўка сучаснага гульнявога абсталявання, бяспечнага пакрыцця на дзіцячай пляцоўцы, міні-вяровачнага гарадка.

«Дето Мир» можа стаць пунктам прыцягнення для моладзі, падлеткаў, дзяцей і іх бацькоў. А калі ўлічыць, што Лёзна знаходзіцца ўсяго за 12 кіламетраў ад Расіі, абноўленая прастора зможа прымаць гасцей з суседняй Смаленскай вобласці.

Мастацтва, даступнае кожнаму

Педагогі Цэнтра творчасці г. Смаргоні (Гродзенская вобласць) сумесна з членамі дзіцячага і падлеткавага парламента распрацавалі ўнікальны праект — перасовачны форум-тэатр «Без меж і па-за ўзростам». Яго мэта — зрабіць спектаклі даступнымі для людзей, якія па розных прычынах не могуць наведаць культурныя ўстановы: дзяцей з нешчаслівых сем'яў, сірот, пажылых людзей, інвалідаў:

— «Фішка» нашага праекта ў яго мабільнасці: спектаклі змогуць



убачыць жыхары розных куткоў раёна, у тым ліку вёсак. Гэта дапаможа разбавіць іх вольны час і прыўнесці радасць у іх жыццё, — распавёў **вучань 11 класа ДУА «Гімназія г. Смаргоні» Назар СТРАХ.**

Перад гэтым каманда праекта правяла апытанне сярод патэнцыяльных гледачоў. Высветлілася, што ідэя запатрабаваная, людзі чакаюць першых спектакляў. На сёння ўсё ўжо гатова да запуску, за выключэннем сцэны і трыбун. Асноўнай, але не адзінай, тэматыкай пастановак стане Вялікая Айчынная вайна. Удзел у іх плануюць прымаць 23 чалавекі, сярод якіх 15 — моладзь і валанцёры. А яшчэ дзяліцца сваім вопытам і атрымліваць радасць ад творчасці змогуць восем пенсіянераў з тэатральнай супольнасці тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва «Цёплы дом».

Новы старт для юных інжынераў

Сёння для сацыяльна-эканамічнага росту нашай краіне вельмі патрэбныя тэхнічныя спецыялісты. Менавіта таму на «Конкурсе маладзёжных ініцыятыў» была прапанавана наступная ідэя: стварыць прастору інжынернай накіраванасці «Лабараторыя будучыні» на базе ўстаноў вышэйшай адукацыі.

Бачыцца, што «Лабараторыя» будзе са спецыялізаваным абсталяваннем, якое дазволіць яе ўдзельнікам — выкладчыкам і студэнтам — абменьвацца вопытам і распрацоўваць інавацыйныя праекты. Прычым у планах не толькі навучанне, але і правядзенне выстаў, конкурсаў, лекцый з удзелам экспертаў у розных галінах: ад інжынераў да дызайнераў і праграмістаў.

Ініцыятыву на конкурсе прадставіла **Аляксандра ГАРБАЧЫК — студэнтка і сакратар пярвічнай арганізацыі ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» з правамі раённага камітэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.** Дзяўчына адзначыла, што штуршком да распрацоўкі праекта сталі неаднаразовыя выказванні кіраўніцтва нашай краіны аб важнасці развіцця інжынерных спецыяльнасцяў:

— Калі я даведалася пра конкурс, адразу зразумела, што хачу ўзяць у ім удзел менавіта з гэтым праектам. Да таго ж хочацца, каб мая ініцыятыва ўсё ж такі была рэалізавана, бо стварэнне такой прасторы дапамагло б моладзі яшчэ са школьных гадоў вызначыцца з будучай прафесіяй. А гэта, у сваю чаргу, умацуе кадравы рэзерв нашай краіны, — падзялілася студэнтка.

Гэтыя і іншыя ўдзельнікі ўжо прадставілі свае ініцыятывы конкурснай камісіі, у якую ўвайшлі парламентарыі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і Міністэрства адукацыі. На працягу месяца ім трэба вызначыць пераможцаў, якім будзе аказана фінансавая падтрымка ў рэалізацыі ідэй.

Аміна НАЗАРАВА.
Фота прадастаўлена БРСМ.

Тыя, хто побач

Бачыць вынік сваёй працы

У Дзяржаўнай установе культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Шклоўскага раёна» паспяхова рэалізуецца праграма падрыхтоўкі кадраў. І крэатыўных бібліятэкараў становіцца ўсё больш. Адзін з іх — малады спецыяліст Шклоўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі Дзмітрый Шведаў.

Хлопец выбраў не зусім тыповую для мужчыны прафесію бібліятэкара. Пасля атрымання дыплома Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў у 2023 годзе Дзмітрый прыбыў на сваё першае працоўнае месца ў Шклоў. І адразу зарэкамендаваў сябе дасведчаным бібліятэчным спецыялістам. А сёння яго ўжо з упэўненасцю можна назваць дастаткова вопытным супрацоўнікам. За амаль два гады працы малады чалавек правёў мноства мерапрыемстваў, якія запомніліся наведвальнікам: экскурсіі, прэзентацыі, бібліятэчныя ўрокі.

Па словах самога Дзмітрыя, галоўнае — бачыць вынік сваёй працы. Хлопец задаволены выбранай прафесіяй і ўдзячны за дапамогу і падтрымку калег. Ён — мэтанакіраваны, творчы і адказны работнік. Праца прыносіць яму сапраўднае задавальненне. І, на думку маладога чалавека, выраз «Кніга — лепшы падарунак» да сёння не страціў сваёй актуальнасці, пакольк на старонках кніжных выданняў утойваецца сапраўдная скарбніца ведаў і цікавых адкрыццяў. Сам хлопец вельмі многае чэрпае з кніг. Карыстальнікам бібліятэкі ён заўсёды параіць, якую кнігу ўзяць для чытання, выходзячы з інтарэсаў таго ці іншага чалавека.

Мае Дзмітрый таксама і практыку работы над рознымі бібліятэчнымі праектамі. У мінулым годзе ў рамках дзяржаўнага прафілактычнага праекта «Здаровыя гарады і пасёлкі» ён узяў удзел у конкурсе, арганізаваным Шклоўскім раённым цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі. Хлопец падрыхтаваў цікавы праект па стварэнні лепшага эскіза лагатыпа «Шклоўскі раён — здаровы раён!». За ўдзел у конкурсе яго ўзнагародзілі падзякай і каштоўным падарункам.

А ў год 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў спецыялісты цэнтральнай бібліятэкі з яго ўдзелам падрыхтавалі ролік «Каб памяталі...» для абласнога конкурсу відэаролікаў сярод публічных бібліятэк «У летапіс Перамогі». Вынік — дыплом III ступені. Дзмітрый, хоць і сціплы па характары, але ніколі не застаецца ў баку ад важных падзей.

— Кожны з нас павінен усведамляць і, я ўпэўнены, усведамляе значэнне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Мы памятаем аб вызваленні нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З таго часу прайшло 80 гадоў. І хоць час аддаляе нас ад тых падзей, але памяць жывая. Каб яе захаваць, мы ў бібліятэцы праводзім розныя мерапрыемствы на патрыятычную тэматыку, рэалізуем тэматычныя праекты, — пракаментаваў Дзмітрый Шведаў.

Хочацца спадзявацца, што такіх спецыялістаў і прыкладаў сапраўднай любові да сваёй краіны і выбранай справы будзе ўсё больш сярод моладзі. А тыя, хто побач, заўсёды падтрымаюць іх, каб не згасалі ў маладых энергія, творчасць і любоў да прафесіі.

Валянціна СУТКАЛЕНКА.



Імёны

«САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — НЕ СПЫНЯЦЦА І РУХАЦЦА ДАЛЕЙ»

Прафесійная спявачка, артыстка, педагог, лаўрэат міжнародных конкурсаў, а яшчэ маці і жонка — усё гэта пра зорку беларускай эстрады Вольгу Булай. Карэспандэнт «ЧЗ. Чырвонай змены» распытала ў артысткі пра поспех і яго складнікі, рэалізацыю планаў, час і натхненне, без якога, пэўна, творчаму чалавеку жыць немагчыма.

Рэалізавала тое, пра што марыла

— Вольга, раскажыце, якім быў ваш шлях да сцэны?

— Я з дзяцінства ведала, кім хачу стаць. Спявала і танцавала, падбірала ўборы дома, уяўляючы сябе артысткай. А ў другім класе паступіла ў музычную школу і марыла аб сцэне. Паколькі я родам з маленькай вёскі Цяпіна, што ў Чашніцкім раёне, то шлях да мары быў даволі няпростым. Даводзілася тры разы на тыдзень дабірацца да музычнай школы, якая знаходзілася за дзесяць кіламетраў ад дома. Успамінаючы пра гэта цяпер, ганаруся той маленькай дзяўчынкай і тым, што не здрадзіла сваёй мары.

Скончыўшы школу, паступіла ў Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў, які даў мне выдатныя тэарэтычную і музычную асновы. Там я сустрэла любімага педагога, сапраўднага прафесіянала сваёй справы — Святлану Аляксандраўну Борахаву. Яна паставіла мне прафесійна голас. З ёй мы займаемся вакалам і сёння, толькі цяпер гэта хутчэй можна назваць творчым саюзам. Пасля заканчэння каледжа ў 2017 годзе паступіла ў БДУКМ. Дарэчы, у абедзвюх установах адукацыі вучылася на спецыяльнасці «Мастацтва эстрады (спевы)». Я прафесійная спявачка! Рэалізавала тое, пра што марыла.

— Калі зразумелі, што вы запатрабаваны артыст?

— Магчымасць упершыню выйсці на вялікую сцэну даў мне Віталь Рыгоравіч (галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік Прэзідэнцкага аркестра Віталь Кульбакоў. — **«Зв.»**). Як цяпер памятаю, ён патэлефанаваў са словамі: «Патрэбна дзяўчына, якая магла б выканаць песні «Zombie» і «Listen to my heart», зможаш?» Зрабіць гэта тэхнічна было даволі няпроста, тры дні я рыхтавалася, хацелася паказаць сябе годна. Пасля прыйшла на рэпетыцыю-праслухоўванне, дзе пачула ад прафесіяналаў, што гучу класна. Той дэбютны канцэрт пад назвай «Класіка сустракае рок» стаў самым хвалявальным у жыцці. Энергетыка на ім зашкальвала. Кожны артыст, каму ўдалося выканаць кампазіцыю з Прэзідэнцкім аркестрам, лічу, пераможца.

— Раскажыце пра вопыт работы ў Маладзёжным тэатры эстрады.

— Працаваць туды запрасіла Уладзіслава Ігараўна Арцюкоўская. Яна, пэўна, разгледзела ў маёй асобе не толькі спявачку, але і актрысу, за што я ёй вельмі ўдзячная. Я ішла туды з упэўненасцю, што буду толькі спяваць, але праз некаторы час мне сказалі: «Будзеш выконваць ролю Вечнасці». Адчувала сябе тады хвалюючa. Мая дачка, Ксенія, была яшчэ зусім маленькая, мы з ёй разам па начах вучылі сцэнарый. Больш таго, адрас, па якім размяшчаецца тэатр, навігатар у машыне доўга вызначаў як дамашні: шмат часу я праводзіла там. Дзякуючы камандзе прафесіяналаў, якія дапамагалі мне, усё склалася як мае быць. Асаблівую падзяку хачу выказаць Руслану Іосіфавічу (міністр культуры Беларусі Руслан Чарнецкі. — **«Зв.»**). Ён не проста выдатны акцёр, але і цудоўны чалавек. Дапамагаў, раскрываў мне, нявопытнай, сакрэты акцёрскага майстэрства, накіроўваў там, дзе гэта было патрэбна.

Хочаш нечага дабіцца — шмат працуй

— Ці лічыце сябе паспяховай цяпер?

— У мяне ёсць усе тыя рэчы, якія ў маім разуменні з'яўляюцца складнікамі поспеху: любімыя дом, работа і сям'я. Я — маці і жонка, запатрабаваны артыст. Калі гаварыць пра кар'еру, нават не магла ўявіць, што буду стаяць побач на адной сцэне з такімі артыстамі як Жанет, Руслан Аляхно, Вікторыя Алешка, Анатоль Ярмоленка — нашымі мэтрамі. Але ж гэта не выпадковасць. Ува мне з дзяцінства было закладзена: хочаш нечага дабіцца — шмат працуй. Самае галоўнае — не спыняцца на месцы і рухацца далей.

— Падзяліцеся, калі ласка, сваімі творчымі планамі на найбліжэйшую будучыню.

— У дзяцінстве марыла пабываць на фестывалі «Славянскі базар», але не атрымлівалася, таму глядзела трансляцыі па тэлевізары. Мяне цікавілі не толькі канцэрты зорак эстрады, але і конкурс, на якім можна праявіць свае творчыя здольнасці. Можа, нават ён у большай ступені. Калі стала займацца творчасцю прафесійна, удзельнічала і двойчы займала ў фіналах на нацыянальных адборах на «Славянскі базар» другое месца. У гэтым годзе зноў вярнулася да думкі, што хачу спаборнічаць, цікава выходзіць з зоны камфорту. Муж маю ідэю падтрымаў: 15 сакавіка едзем у Іванава на фінал нацыянальнага адбору да міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні. Трымайце за мяне кулачкі!

— Над чым яшчэ працуеце?

— Мы з мужам працуем у тым ліку над рок-праектам «SHAMARHANA». Яго назва — маё дзявочае прозвішча. Альтэр-эга, скажам так. Рок-музыка мне вельмі падабаецца, хоць я часцей выконваю поп-музыку ці рамансы. Рок мае неверагодную энергетыку. У оперы мой персанаж спявае аб чыстым, светлым каханні. Мне б хацелася праз сваю творчасць заявіць, што сям'я і каханне павінны заставацца найважнейшымі каштоўнасцямі чалавека.

Імкнуся знаходзіць баланс

— Вашы адметнасці — мэтанакіраванасць і нястомны аптымізм...

— Усё ідзе з дзяцінства. Я тады сабе паставіла мэты і паступова іду да іх. А наконт аптымізму, у мяне за плячыма цудоўная сям'я, якая ва ўсім падтрымлівае, прымае маю занятасць, таму ўсё атрымліваецца.

— Раскажыце пра ўдзел у агульнарэспубліканскай акцыі «Разам з мастацтвам»...

— «Разам з мастацтвам» — жывы дыялог. Фармат праекта мне вельмі падабаецца: мы дзелімся з людзьмі гісторыямі поспеху, жыцця і творчасці. Я думаю, і аўдыторыі гэта цікава, таму што мы сваім прыкладам даказваем і расказваем, што ў нашай краіне кожны можа дабіцца поспеху. Не мае значэння, колькі ў цябе грошай або з якой ты сям'і. Стаў мэты — і ўсё атрымаецца. Цікава, што ёсць магчымасць гаварыць пра гэта з людзьмі. Плюс да ўсяго гэта папулярызацыя нашай творчасці. Я ніколі раней столькі не падарожнічала, таму адзначу яшчэ і магчымасць убачыць кожны куток роднай Беларусі.

— Ці застаецца час на сябе пры такой занятасці?

— Работы сапраўды вельмі шмат, і мне гэта падабаецца. На хобі часам сіл не хапае, але імкнуся знаходзіць баланс. Тут галоўнае задацца мэтай.

— Дзе вы чэрпаеце натхненне?

— Захапляюся гарамі і морам. Раз на год мы з сям'ёй выязджаем у падарожжа. Яны — мая лепшая кампанія.

Яна ВАЛАСАЧ.
Фота з асабістага архіва гераіні.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда», грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД № 38200000007667 ад 03.04.2004.
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 11.276.
Нумар падпісаны ў 19.30 05.03.2025 г.

ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Призы в приложении Каталог Onliner 5»

Настоящие правила проведения рекламной игры (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением «О проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь», утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), определяют порядок проведения рекламной игры «Призы в приложении Каталог Onliner 5» (далее – Рекламная игра).

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующие значения:

Интернет-сайт Организатора – размещенный в глобальной сети Интернет сайт (интернет-ресурс), расположенный по адресу: https://www.onliner.by.

Пользователь – физическое лицо, использующее интернет-сайт Организатора и приложение Каталог Onliner.

Каталог Onliner – приложение для мобильных устройств под управлением iOS и Android, позволяющее потребителям осуществлять выбор и покупку товаров на интернет-сайте Организатора (версии не ниже 2.6 в App Store, 2.12.0 в Google Play, 2.13.0 в AppGallery).

Учетная запись (профиль) – хранимая в компьютерной системе совокупность данных о пользователе сайта и приложения Каталог Onliner, необходимая для его аутентификации и предоставления доступа к его личным данным и настройкам.

Onliner Pay – сервис онлайн-оплаты товаров на интернет-сайте Организатора и в приложении Каталог Onliner, позволяющий осуществлять оплату товаров безналичным способом с использованием валидированной, привязанной к учетной записи (профилю) пользователя банковской платежной карточки. Сервис реализует механику безопасной оплаты. Партнерами сервиса выступают «МТБанк» и платежный сервис bePaid. Процессинговая система bePaid соответствует всем требованиям стандарта безопасности PCI DSS Level 1, который регламентирует прием, обработку и хранение карточных данных.

Банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Minipay – программа по предоставлению онлайн-кредита/рассрочки для физических лиц от ЗАО «Альфа-Банк».

1. Организатор Рекламной игры

1.1. Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

2. Наименование Рекламной игры

2.1. Настоящая Рекламная игра называется «Призы в приложении Каталог Onliner 5».

3. Территория проведения Рекламной игры

3.1. Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь.

4. Срок начала и окончания Рекламной игры

4.1. Рекламная игра проводится с 10.03.2025 по 12.05.2025 (учитывая период, когда Участник должен оформить заказ и приобрести участвующие в Рекламной игре товары, а также включая сроки проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения Рекламной игры).

5. Цель проведения Рекламной игры

5.1. Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж товаров, реализуемых интернет-магазинами, размещенными на сайте Организатора в разделе https://catalog.onliner.by, посредством использования приложения Каталог Onliner.

6. Комиссия по проведению Рекламной игры

6.1. Для проведения Рекламной игры Организатор создает комиссию по ее проведению (далее – Комиссия), осуществляющую контроль за соблюдением установленных Правил.

6.2. Состав Комиссии

Председатель Комиссии:

- Кажуро Денис Петрович, ООО «Онлайнер», директор.

Члены Комиссии:

- Семашкевич Андрей Славомирович, ООО «Надо поговорить», директор;

- Голуб Герман Юрьевич, ООО «Онлайнер», заместитель директора – начальник управления коммерции;

- Ильинцева Екатерина Андреевна, ООО «Онлайнер», заместитель директора;

- Калинина Алена Николаевна, ООО «Онлайнер», начальник отдела продаж и ассортимента управления коммерции.

7. Участники Рекламной игры

7.1. Участник – физическое лицо, приобретающее на сайте Организатора товар для личных, семейных, домашних и иных нужд, не связанных с осуществлением предпринимательской деятельности, посредством использования приложения Каталог Onliner, выразившее желание принять участие в Рекламной игре на условиях, предусмотренных в настоящих Правилах.

7.2. В Рекламной игре могут принимать участие лица, достигшие совершеннолетия.

7.3. Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, лица, находящиеся с ним в отношениях свойства.

7.4. Каждый Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии выполнения требований, закрепленных в п. 8.1–8.2 настоящих Правил.

8. Порядок участия в Рекламной игре

8.1. Для участия в Рекламной игре Участнику необходимо:

8.1.1. зарегистрировать на интернет-ресурсе https://www.onliner.by либо в приложении Каталог Onliner учетную запись (профиль) на заявленных Организатором условиях (https://blog.onliner.by/siterules);

8.1.2. подтвердить свое согласие на участие в Рекламной игре в панели управления учетной записи (профиля) на сайте Организатора либо посредством нажатия на баннер с информацией о проведении настоящей Рекламной игры на главной странице приложения Каталог Onliner, при этом в специальных полях указать свои достоверные персональные данные – фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) полностью в срок до 30.03.2025 (включительно);

8.1.3. привязать к учетной записи (профилю) банковскую платежную карточку, которую пользователь планирует использовать для осуществления онлайн-оплаты товаров через сервис Onliner Pay, либо выбрать в форме заказа способ оплаты Minipay и пройти авторизацию в Межбанковской системе идентификации и заполнить заявку на получение онлайн-кредита/рассрочки от ЗАО «Альфа-Банк»;

8.1.4. в период с 10.03.2025 по 30.03.2025 (включительно) оформить в приложении Каталог Onliner заказ на приобретение одного либо нескольких товаров на сумму не менее чем **20** (двадцать) белорусских рублей **00** (ноль) копеек в интернет-магазинах, размещенных на сайте Организатора в разделе https://www.catalog.onliner.by, оплатить заказанный товар в онлайн-режиме через сервис Onliner Pay, воспользовавшись для этих целей привязанной к учетной записи (профилю) пользователя банковской платежной карточкой, либо произвести оплату с использованием онлайн-кредита/рассрочки Minipay от ЗАО «Альфа-Банк».

8.2. Участниками Рекламной игры становятся пользователи, которые успешно выполнили приведенные выше в п. 8.1 требования, при условии, что их заказ в последующем получит статус «Доставлен» в срок до 06.04.2025 (включительно) и итоговая сумма приобретенного (выкупленного) пользователем товара (товаров) составит не менее чем **20** (двадцать) белорусских рублей **00** (ноль) копеек.

Статус «Доставлен» присваивается заказу пользователя в случае, когда последний фактически принял от продавца хотя бы один товар из оформленного им заказа.

8.3. Каждый надлежаще совершенный и оплаченный пользователем заказ получит свой уникальный номер согласно дате и времени оформления заказа. Информация о присвоенном заказу уникальном номере будет отправлена пользователю на указанный им в процессе оформления заказа электронный почтовый ящик. Соответствующее сообщение поступит пользователю в течение 1 (одного) часа с момента оформления заказа. В случае успешного завершения процедуры приобретения товара заказ пользователя получит статус «Доставлен». Уведомление об изменении статуса заказа будет отправлено пользователю на его электронную почту, а также данная информация будет дополнительно транслироваться на сайте Организатора в персональной учетной записи (профиле) пользователя. Такое сообщение поступит пользователю в течение 1 (одного) часа с момента вручения ему заказа продавцом.

9. Призовой фонд

9.1. Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет имущества и денежных средств Организатора в размере **13 493** (тринадцать тысяч четыреста девяносто три) белорусских рубля **86** (восемьдесят шесть) копеек.

9.2. Призовой фонд Рекламной игры:

Наименование приза		Количество, шт.	Стоимость за ед., бел. руб.	Всего стоимость, бел. руб.	Ставка НДС, %	Сумма НДС, бел. руб.	Всего стоимость с НДС, бел. руб.
Приз 1	**Смартфон Samsung SM-S938B/DS, 256GB, серый, (SM-S938BZTBCAU)**	1	4 059,27	4 059,27	20 %	811,85	4 871,12
	Денежные средства в размере		693,50	693,50	–	–	693,50
Приз 2	**Смартфон Samsung SM-S936B/DS, 256GB, серебряный, (SM-S936BZSBCAU)**	1	3 261,77	3 261,77	20 %	652,35	3 914,12
	Денежные средства в размере		550,50	550,50	–	–	550,50
Приз 3	**Смартфон Samsung SM-S931B/DS, 128GB, голубой, (SM-S931BLBBCAU)**	1	2 536,77	2 536,77	20 %	507,35	3 044,12
	Денежные средства в размере		420,50	420,50	–	–	420,50
Итого:							**13 493,86**

10. Время и место проведения розыгрыша призового фонда Рекламной игры

10.1. Розыгрыш призового фонда проводится 11.04.2025 в 12:00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, ООО «Онлайнер».

10.2 Розыгрыш проводится среди Участников, надлежаще выполнивших условия участия в Рекламной игре, в соответствии с требованиями настоящих Правил.

11. Порядок проведения розыгрыша призового фонда, уведомления Участников и определения Победителей Рекламной игры

11.1. До момента проведения розыгрыша призов Рекламной игры Комиссия формирует Список Участников Рекламной игры, успешно выполнивших все условия настоящих Правил. Список формируется в хронологическом порядке по дате и времени оформления Участниками заказов. Каждый такой заказ получит свой порядковый итоговый номер, который будет являться участвующим в розыгрыше Игровым кодом. При совпадении даты и времени оформления Участниками заказов формирование Игровых кодов, присваиваемых заказам, будет осуществляться в алфавитном порядке по фамилии, имени, отчеству Участника. Нумерация Игровых кодов в Списке начинается с 1 (единицы).

11.2. Список включает в себя следующую информацию о допущенных к розыгрышу Участниках: Игровой код Участника; номер заказа; дату и время оформления заказа; дату и время присвоения заказу статуса «Доставлен»; дату и время, когда Участник подтвердил свое желание принять участие в Рекламной игре; фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) Участника полностью.

11.3. Список допущенных к розыгрышу Участников без указания их персональных данных (Игровой код Участника; номер заказа; дата и время оформления заказа; дата и время присвоения заказу статуса «Доставлен»; номер учетной записи (профиля) Участника на сайте Организатора и в приложении Каталог Onliner; дата и время, когда Участник подтвердил свое желание принять участие в Рекламной игре) будет опубликован Организатором на сайте https://www.onliner.by (https://b2bblog.onliner.by) до 12.00 10.04.2025. Не менее чем за сутки до даты проведения розыгрыша призового фонда Рекламной игры, указанной в п. 10.1 настоящих Правил, Организатор уведомит Участника о его Игровом коде (номере) в Списке путем направления соответствующего уведомления на адрес электронной почты, указанный Участником при регистрации учетной записи (профиля) на сайте https://www.onliner.by либо в приложении Каталог Onliner.

11.4. Для проведения розыгрыша используется лототрон, состоящий из одной секции, и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9.

11.5. Определение выигрышных Игровых кодов получателей призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из секции лототрона. Розыгрыш начинается с определения первого разряда Игрового кода Победителя слева.

11.6. Первый разряд Игрового кода Победителя определяется следующим образом: в секцию лототрона загружаются шары с номерами от 0 до цифры, соответствующей первому разряду зарегистрированного Игрового кода. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру первого разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Далее в сектор лототрона загружаются те номера шаров, которые существуют по сверенному списку Игровых кодов в соответствующем разряде. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет очередную цифру соответствующего разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Для определения последующих разрядов выполняются те же действия.

11.7. Выигравшим приз в розыгрыше считается Игровой код Участника, определенный согласно п. 11.4 — 11.6 настоящих Правил. Номера шаров вносятся в протокол.

11.8. Результаты розыгрыша фиксируются в протоколе, который подписывается всеми присутствующими членами Комиссии.

12. Сроки и порядок уведомления Победителей о результатах розыгрыша призов Рекламной игры

12.1. Организатор в течение 7 (семи) календарных дней с момента проведения розыгрыша уведомляет Победителя о выигрыше письмом, высланным на электронную почту, указанную Победителем при регистрации своей учетной записи (профиля) на сайте https://www.onliner.by либо в приложении Каталог Onliner. Организатор также вправе дополнительно уведомить Победителя любым удобным ему способом: посредством SMS-рассылки на номер мобильного телефона, звонком по телефону и др.

13. Порядок получения выигрышей

13.1. Для получения приза Победители должны явиться не позднее 12.05.2025 г. (включительно) по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, предварительно связавшись с Организатором по номеру многоканального телефона: +375 (29) 514-35-24.

13.2. Получить приз можно с понедельника по пятницу, с 10:00 до 17:00 (исключение составляют приходящиеся на официальные праздники дни), а также в субботу, 26.04.2025 г., с 10:00 до 13:00. При получении приза Победитель предъявляет документ, удостоверяющий личность.

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения, заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором, связанные с получением приза.

13.3. В случаях невозможности связаться с Победителем для уведомления о выигрыше указанными в п. 12.1 способами; неявки Победителя за получением приза в определенный в п. 13.1 срок; указания недостоверных персональных данных в панели управления учетной записью пользователя на интернет-сайте Организатора либо в приложении Каталог Onliner; непредоставления Организатору сведений и документов, необходимых для получения приза; письменного отказа от получения приза либо отказа от подписи в документах, подтверждающих передачу приза, — Победитель лишается права на получение приза. В этих случаях приз остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

13.4. Выигрыши победителям Рекламной игры и (или) их наследникам, опекунам или законным представителям, включенным на дату выдачи выигрыша в определяемый в установленном порядке перечень физлиц, причастных к террористической деятельности, не выдаются.

13.5. В случае смерти либо признания недееспособным победителя Рекламной игры право на получение выигрыша может быть реализовано его наследниками, опекунами или законными представителями не позднее 7 месяцев со дня окончания Рекламной игры.

13.6. В соответствии с главой 18 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор выступает налоговым агентом и при вручении Победителю выигрыша обязан удержать у последнего причитающиеся денежные средства в качестве уплаты подоходного налога с получателя приза.

13.7. Расходы, связанные с проездом Победителя к месту получения приза, Организатором не возмещаются.

13.8. Приз не подлежит замене. Выплата денежного эквивалента приза не осуществляется.

13.9. Приз не подлежит выдаче победителю иначе как в порядке, предусмотренном настоящими Правилами.

14. Опубликование правил и результатов Рекламной игры

14.1. Правила подлежат опубликованию до начала проведения Рекламной игры в газете «Звязда» и на сайте Организатора — https://www.onliner.by.

14.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы на сайте Организатора — https://www.onliner.by (https://b2bblog.onliner.by/promo) — в срок до 08.05.2025 г. (включительно).

14.3. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на сайте Организатора (https://b2bblog.onliner.by/promo), а также по номеру многоканального телефона: +375 (29) 514-35-24. Звонок платный, в соответствии с тарифами оператора электросвязи, услугами которого пользуется Участник.

15. Общие условия Рекламной игры

15.1. Участие в рекламной Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участника с настоящими Правилами, принятие на себя обязательств по соблюдению всех условий и требований. Несоблюдение Участником требований настоящих Правил признается как его отказ от участия в Рекламной игре.

15.2. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участник соглашается с использованием его персональных данных в публикациях, связанных с опубликованием результатов Рекламной игры на сайте Организатора — https://www.onliner.by.

15.3. Организатор вправе отстранить Участника от участия в Рекламной игре, отказать в выдаче приза при нарушении последним требований настоящих Правил.

15.4. Ответственность за указание достоверных персональных данных для участия в Рекламной игре возлагается на Участника.

15.5. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги по подключению к сети Интернет Участника), операторов сотовой подвижной электросвязи и организаций, оказывающих услуги интернет-эквайринга (плохое соединение с оператором, отсутствие интернет-эквайринга и т. д.), и почтовых сервисов (несвоевременная доставка электронных сообщений и т. д.).

15.6. При наличии споров между Организатором и Участником Рекламной игры они разрешаются в установленном законодательством Республики Беларусь порядке.

